# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**ПАЧЫНАЕМ НОВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ**

У конкурсе — 18 заданняў. Адказы на іх ацэньваюцца пэўнай колькасцю ачкоў, як правіла, роўнай колькасці хадоў ва ўмове задачы. Пабочныя рашэнні ацэньваюцца, як і асноўныя. Гэта ж датычыцца і выпадку доказу нерашальнасці задання. За ўказанне хоць бы аднаго падманлівага следу налічваецца ачко, якое ўлічваецца пры размеркаванні месцаў пры роўнай колькасці набраных ачкоў. За правільнае рашэнне эцюда налічваецца 5 ачкоў.

Правілы афармлення рашэнняў традыцыйныя. Толькі ў пісьме-адказе трэба коратка прыводзіць рашэнне папярэдняга задання. Тэрмін прысылкі адказаў на заданні — 12 дзён з дня апублікавання. Запрашаем да ўдзелу ў новым конкурсе!

Пераможцы прэміруюцца літаратурай. У выпадку вялікай колькасці пераможцаў журы конкурсу пакідае за сабой права даць 2 дадатковыя заданні.

Адказы дасылайце на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, «Шахматы».

**Заданне № 1.**



Мат за 2 хады. (4+3).

**Заданне № 2.**



Мат за 2 хады. (5+3).

**ШАХМАТНАЯ ПЕРЫЁДЫКА**

Сярод шахматных часопісаў першае месца па праву займае «64—Шахматное обозрение», які нядаўна адзначыў сваё 40-годдзе. Часопіс разлічаны на шырокае кола чытачоў і таму на яго старонках можна адшукаць матэрыялы па ўсіх пытаннях развіцця шахмат. У ім прысутнічае тэарэтычны аддзел, аддзел кампазіцыі, шмат месца адводзіцца запісу партый, згуляных у буйных спаборніцтвах. Часопіс «64—ШО» распаўсюджваецца па падпісцы.

У Расіі выходзяць таксама часопісы па шахматнай кампазіцыі: «Шахматная композиция», «Задачи и этюды», «Уральский проблемист».

У Беларусі выходзіць часопіс «Шахматы», у якім асвятляецца мясцовае шахматнае жыццё. Ёсць шмат пазнавальнага матэрыялу. На яго прымаецца свабодная падпіска. Але вам на дапамогу можа прыйсці Леанід Уладзіміравіч Шацько. Ваш заказ на часопісы, а таксама на іншую шахматную літаратуру накіроўвайце на адрас: 220016, г. Мінск, а/с 150, Шацько Леаніду Уладзіміравічу.

# СКАНВОРД + ЛАБІРЫНТ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.




| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Б | Е | Р | В | А | Л | І | А | Р | А | І |
| К | А | Р | Я | Н | О | М | Г | М | Д | К |
| І | Б | А | С | Я | І | П | П | О | Г | У |
| Р | О | Ў | К | Д | Д | Э | Е | К | І | Л |
| П | Е | К | Е | А | С | Л | А | П | Н | С |
| П | Р | А | Т | Б | Т | Ь | Т | Л | А | Е |
| Е | А | К | Л | О | А | Ё | Н | Г | Н | К |
| Н | А | Л | А | Л | Д | Ы | Н | А | Н | У |
| М | А | Ь | Д | З | Е | Г | Д | Б | Д | А |
| А | Р | Ц | І | І | Б | Э | Н | О | Л | М |
| Ф | О | Н | А | Н | Т | Р | Е | Р | Р | Е |

**ЛАБІРЫНТ.** Гэтым разам у лабірынце схаваліся словы на спартыўную тэматыку. У дужках пазначана колькасць літар у загаданых словах. Літары сплятаюцца ў словы па гарызанталях (злева направа і справа налева) і па вертыкалях (зверху ўніз і знізу ўверх), але не па дыяганалях. Гэта традыцыйныя правілы. Адно слова ў якасці ўзору пазначана.

**1.** Комплексныя міжнародныя спаборніцтвы (9). **2.** Гарналыжны від спорту (5). **3.** Гімнастычны снарад; калісьці бум (7). **4.** Тое, што і ручны мяч (7). **5.** Ход 0-0-0 або 0-0 у шахматах (9). **6.** Від спорту для высакарослых (9). **7.** Сталіца сёлетняй Алімпіяды (5). **8.** Звышлёгкі лятальны апарат (10). **9.** Футбольныя вароты: ***, дзве стойкі і сетка (12). **10.** У лёгкай атлетыцы — адметны раздзел (3). **11.** Горад у Грэцыі, адкуль пайшоў бег на звышдалёкія дыстанцыі (7). **12.** Комплекснае спартыўнае збудаванне (7). **13.** Хранометр спартыўнага арбітра (10). **14.** Настаўнік, выхавацель спартсмена, каманды (6). **15.** Неалімпійскі від спорту (7). **16.** Адзінаццаціметровы штрафны ўдар у футболе (8).

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Сканворд (15 ліпеня). Па гарызанталі:** Слайд. Вакзал. Дуля. Мазь. Ост. Ігар. Пак. Нуда. Цяга. Пік. Руль. Арабіна. Вар. Якар. Рант. Жаба. Мастак. Пурга. Вандал. Парк. Камета. Гора. Алі. Статар. Гарт. Марабу. Урал. Гданьск. Акарына. **Па вертыкалі:** Лезгінка. Гапак. Адвал. Бур. Арка. Піва. Лоцман. Гліна. Макі. Дуда. Карма. Гарус. Узор. Самба. Арк. Вальс. Рыба. Туя. Ула. Квас. Барс. Яранга. Полька. Дот. Ангара. Былінка. Орт. Ларнетка.

**Сканворд (23 ліпеня). Па гарызанталі:** Гром. Цымбалы. Лось. Кіпа. Ікс. Край. Паж. Ідал. Здор. Юка. Улан. Арсенал. Аўт. Гало. Іней. Кола. Снягір. Мулат. Эпатаж. Ірга. Аналой. Рота. Хан. Статар. Факт. Паркан. Зона. Базальт. Рахунак. **Па вертыкалі:** Мандаліна. Домра. Хамса. Луг. Алах. Юнак. Алупка. Рукаў. Стан. Малі. Алтын. Ферзь. Опій. Ягада. Кот. Цясак. Клан. Суд. Нар. Рэйс. Брук. Гітара. Прапан. Тот. Легата. Банджа. Рой. Жарнавік.

**Сканворд (2 жніўня). Па гарызанталі:** Барак. Хірург. Драп. Арол. Мяч. Штаб. Гіт. Ейск. Эдэм. Бум. Журы. Тэарэма. Рой. Гума. Аніс. Каса. Шар. Цішка. Акуліст. Рагу. Рапарт. Ёлка. Гуж. Пакт. Клубок. Лато. Тлум. Стаматолаг. **Па вертыкалі:** Тэрапеўт. Мацак. Іслам. Сіг. Ашуг. Бэра. Унікум. Трумо. Шарж. Кедр. Майка. Паулс. Ромб. «Рэпка». Бат. Хваля. Квота. Чад. Арат. Ком. Акт. Імжа. Галлё. Гарпун. Іл. Мінск. Педыятр. Час. Таганрог.

Інфарм-укол

# Колькі гадоў у сапраўднасці?

**Неабходна адрозніваць храналагічны ўзрост ад біялагічнага. Біялагічны не паказвае працягласці жыцця, а толькі інфармуе аб тым, як арганізм вытрымлівае жыццёвыя праграмы, закладзеныя ў ім генетычна. Праверым сябе.**

**Узрост скуры** можна вызначыць так: вялікім і ўказальным пальцамі вазьміце скуру на тыльным баку далоні і адцягніце яе на 5 секунд. Калі сляды зашчамлення знікнуць за пяць ці меней секунд, то біялагічны ўзрост вашай скуры не перавышае 45 гадоў, за 6—15 — 60 гадоў, за 16—55 — 70. **Узрост вачэй**. Прачытайце газетны тэкст на максімальна блізкай ад вачэй адлегласці і памерайце яе лінейкай. Ва ўзросце 21 года пры адсутнасці паталогіі зроку чалавек можа чытаць газету на адлегласці 10 см ад вачэй, у 34 гады — 14 см, а да 60 гадоў гэта адлегласць павялічваецца да метра. **Хуткасць рэакцыі** правяраем так: станьце, выцягніце руку наперад, пальцы прамыя, далоні ўнутр. Партнёр размяшчае 40-сантыметровую лінейку паралельна вашай далоні на адлегласці 1-2 см, нулявая адзнака знаходзіцца на ўзроўні ніжняга краю далоні. Па камандзе «ўвага» партнёр на працягу 5 секунд павінен апусціць лінейку. Ваша задача як мага хутчэй сціснуць пальцы ў кулак і затрымаць падзенне лінейкі. Біялагічны ўзрост вызначаецца па месцы перахвату лінейкі. Паказчык 12 см адпавядае ўзросту 20 гадоў, паказчык 25 см — 60. **Раўнавага** (работа вестыбулярнага апарата). Стойце як мага даўжэй басанож на адной назе, рукі ў бакі, вочы заплюшчаны. Калі вы прастаіце звыш 30 секунд, ваш арганізм яшчэ малады, а калі менш за 5 секунд, значыць, пасталеў.

Памятайце, што эмацыянальны фон і фізічны стан цесна звязаныя. Чалавек актыўны, бадзёры і жыццярадасны даўжэй захоўвае добрую фізічную форму. Песіміст, які пастаянна скардзіцца, можа прымусіць свой арганізм пасталець заўчасна. Станоўчыя эмоцыі спрыяльна ўздзейнічаюць на нервовую сістэму, а, значыць, і на арганізм у цэлым.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**




**Вельмі не хочацца вас хваляваць, дарагія мае кулінары, але, калі вы не заўважылі, лета зноў заканчваецца! І так заўсёды — чакаеш яго ўвесь год, а ў жніўні разумееш, што яшчэ нават ні разу не купаўся. Таму давайце закінем усе клопаты і пагрэемся на сонейку дзе-небудзь каля рэчкі. А каля вады, як вядома, заўсёды апетыт з'яўляецца. Таму сёння будзем гатаваць закускі для пікніка.**

**ЧЫПСЫ ПАХОДНЫЯ**

Ведаю, што чыпсы не самы карысны прадукт, таму выбірайце максімальна натуральныя. Дарэчы, глядзела перадачу «Кантрольная закупка», у якой незалежныя эксперты найбольш натуральнымі прызналі чыпсы «Lays».

Нам спатрэбіцца: вялікі пачак чыпсаў, 2 плаўленыя сыркі, 1 бляшанка шпротаў або шпротнага паштэту.

Дома прапусціце праз мясарубку плаўленыя сыркі і шпроты. Добра перамяшайце і атрыманую масу ўпакуйце ў баначку. На прыродзе застанецца толькі адкрыць пакет з чыпсамі і на кожны кружочак выкласці па 1 чайнай лыжцы прыгатаванай сумесі. Паспрабуйце — гэта смачна, хутка і сытна!

**КУРЫЦА Ў СЫРЫ**

Мне прыйшлося гатаваць гэту страву ў 12 ночы, калі нечакана высветлілася, што праз 20 хвілін у нас госці! Атрымалася вельмі хутка і смачна. Па-мойму, вельмі падыдзе для вылазкі на прыроду.

Вазьміце: курынае філе, малако, 2 яйкі, цвёрды сыр, крухмал, паніровачныя сухары, соль і перац на смак.

Курынае філе крыху адбіце, пасаліце, паперчыце. (Я, карыстаючыся рэцэптам, папярэдне абсмажыла курыцу, але потым зразумела, што гэта было лішнім.) Для кляру ў місачцы змяшайце яйкі, цвёрды сыр, малако і дабаўце крухмал. Праўда, у мяне пад рукой не аказалася крухмалу, я замяніла яго мукой, і мая курыца атрымалася смачнай, але не хрумсткай. На патэльні разагрэйце алей. Кускі курыцы абмакніце ў сырнай сумесі, затым абкачайце ў паніровачных сухарах і абсмажце да залацістай скарынкі.

**КАБАЧКОВАЯ ПІЦА**

Прадоўжым эксперыменты з кабачкамі. Упэўнена, што ад гэтай стравы не застанецца ні аднаго кавалачка — спадабаецца ўсім!

Вазьміце: кабачок, 500 г мяснога фаршу, 200 г сыру, маянэз, соль, перац і зяленіва на смак.

Кабачок трэба ачысціць ад лупіны і нарэзаць нятоўстымі кольцамі. На бляху наліць крыху алею, выкласці кружочкі кабачкоў так, каб не было прасветаў паміж імі. На іх — мясны фарш, затым маянэз, а зверху ўсё пасыпаць дзёртым сырам і зяленівам. Запякаць у духоўцы дзесьці 25 хвілін, да той пары, пакуль кабачкі не стануць мяккімі.

Прыемнага апетыту, мае дарагія. І галоўнае, памятайце, што на прыродзе ўсё ж галоўнае не ежа, а кампанія!

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

## Пяціроr



***У блакітным полі залатая пяцікутная пентаграма (зорка цара Саламона). На ёй — срэбная лілея.***

Герб роду Малінскіх.

## Лукач




***У блакітным полі чырвоны мур, перад ім паўдзіка з двума залатымі каласамі ў пашчы.***

Герб роду Лунеўскіх.

**Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.**

# Чытайце ў наступным нумары

## «...НЕ ЧУВАЦЬ ТАМ ПРА АНГЛІЙСКІ ПАРЛАМЕНТ...»

Фізічная геаграфія тут выглядае наступным чынам: круглы зямны шар, на адным баку якога знаходзіцца Вестмінстэрскі палац і ўсё, што з ім, а на супрацьлеглым — Расоншчына. Пра гэта пісаў яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя Ян Баршчэўскі: «Калі хто, будучы ў гэтым краі, узышоў на вяршыню Пачаноўскай гары і глядзеў на дзікія ваколіцы, што ляжаць навокал, дык бачыў, як азёры тут і там, нібы люстэркі, адбіваюць дзённы прамень, а над іх берагамі дрэмлюць густыя лясы; ...але не ўбачыш тут нідзе гарадскіх муроў, ні вежаў старога замка. Там чалавек забывае пра спрэчкі французскай палаты ў справе Егіпта і Турцыі, не чуваць там пра англійскі парламент, ...не гамоняць там ні пра чыгункі, ні пра дзівосную вынаходку Дагера. І толькі голас пастушка, стрэл паляўнічага ў лесе або вецер, што гойсае ў вершалінах пушчы, парушаюць на хвіліну цішыню ваколіцы...»

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.38 | 20.51 | 15.13 |
| Віцебск — | 5.22 | 20.46 | 15.24 |
| Магілёў — | 5.28 | 20.41 | 15.13 |
| Гомель — | 5.30 | 20.32 | 15.02 |
| Гродна — | 5.54 | 21.06 | 15.12 |
| Брэст — | 6.00 | 21.01 | 15.01 |

**Месяц**

*Першая квадра.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

**Пр.** *Анфісы, Марфы, Германа, Клімента, Мікалая, Навума, Панцеляймона, Савы.*
**К.** *Ірыны, Клары, Тэрэзы, Эдзіты, Рамана, Рамуальда.*




## Дзве даты

## 9 жніўня

**Сёння — Міжнародны дзень карэнных народаў свету.**



**1944 год** — распачаў працу Мінскі аўтазборачны завод, на базе якога затым быў утвораны Мінскі аўтамабільны завод (МАЗ).

**480 год да н.э.** — 300 спартанцаў спынілі персідскую армію каля Фермапіл (гэта адлюстравана ў галівудскім фільме «300 спартанцаў»).

## Цытата дня:

***«Не трэба скардзіцца, што твае мары не збыліся; заслугоўвае жалю толькі той, хто ніколі не марыў».***

**Марыя Эбнер-Эшэнбах (1830—1916), аўстрыйская пісьменніца.**

# СУБОТА

Свет і сусвет чалавека

**Назва гэтага дня паходзіць са старажытнаіудзейскай мовы, у якой sabbat — заканчэнне нейкай справы, працы (шабаш). У Старым запавеце аб гэтым дні сказана, што гэта дзень адпачынку ад розных спраў. Вельмі часта адбываецца блытаніна ў разуменні структуры старажытнаіудзейскага і еўрапейскага хрысціянізаванага тыдня. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што ў славянскім календары тыдзень пачынаўся з нядзелі, таму што субота лічылася днём адпачынку. Насамрэч, у славян з часоў распаўсюджання хрысціянства ролю старазапаветнай суботы выконвала новазапаветная нядзеля — дзень уваскрэшання Ісуса Хрыста.**

● Знаёмства са структурай беларускага народнага календара паказвае, што субота была днём незвычайным у плане сакральна-магічнага напаўнення. У гэты дзень нашы продкі быццам бы па спецыяльным інфармацыйным канале дакраналіся да шматлікіх таямніц Сусвету, наладжвалі кантакты з душамі памерлых сваякоў, звярталіся да іх з просьбай аб добрым ураджаі ці шчаслівай долі маладых, якія бралі шлюб. З цягам часу ў народным календары на працягу ўсяго года з'явіліся адпаведныя суботы, якія лічацца днямі памяці і ўшанавання продкаў. У беларускім асяродку такія дні сталі звацца «Дзядамі», ці «радзіцельскімі суботамі».

● «Суботні» рытуальны дыялог з продкамі ўплываў на некаторыя абрадавыя кантэксты ў культуры беларусаў. Таму ў «радзіцельскія суботы» не праводзяць вянчанне ў праваслаўных храмах.

● У славянскай народнай традыцыі субота лічыцца жаночым днём, якому адпавядае лік 6. Народная свядомасць ставіцца да яго як да добрага, «лёгкага», спрыяльнага дня, можа, таму, што наперадзе яшчэ адзін дзень адпачынку.

● У суботу звычайна прыбіраюцца ў хаце, на гаспадарчым падворку.

● Субота лічыцца спрыяльным днём для ад'езду ў далёкі шлях.

● У той жа час народная традыцыя папярэджвае: не пачынайце ў суботу адказныя справы, асабліва будаўніцтва — нічога ладнага не атрымаецца. У гэты дзень можна было толькі закласці падмурак новай, будучай хаты.

● Калі тканіна была выткана ў суботу, то адзенне з яе шылі толькі для дарослых. Дзіцяці насіць адзенне з яе катэгарычна забаранялася.

● Нашы продкі былі перакананыя: калі дзіця нарадзілася ў суботу, яно будзе лекарам, знахаром, а таксама будзе бачыць з'яўленне духаў сваіх продкаў.

● **Народжаныя ў суботу — меланхалічныя, крыху адасобленыя людзі. А калі злуюцца, дык пасля затухання гневу імкнуцца як мага хутчэй папрасіць прабачэння. Яны не супраць пажыць за чужы кошт, лічаць сябе вельмі разумнымі, і калі дазволяць каму-небудзь даць сабе параду, дык усё роўна яе ніколі не выкарыстаюць. Да сталага веку яны выглядаюць стройнымі, не любяць упрыгожвацца, адрозніваюцца старамодным адзеннем, бо лічаць, што не ў адзенні шчасце.**

ОАО «ГУМ»
ШКОЛЬНЫЙ СЕЗОН в ГУМе
ДО 20 АВГУСТА АКЦИЯ
В секциях детской одежды и обуви предоставляется СКИДКА 5%
При покупке канцелярских и школьно-письменных принадлежностей на сумму 50 000 рублей и выше ВРУЧАЕТСЯ ПОДАРОК
КРЕДИТ ДО 31 АВГУСТА НА ТОВАРЫ ШКОЛЬНОГО АССОРТИМЕНТА:
●одежду, обувь
●школьно-письменные принадлежности
●канцтовары
●портфели, ранцы
При покупке на общую сумму 350 000 руб. и выше: на 3 и 6 месяцев без уплаты процентов за кредит первоначальный взнос — 10%
www.gum.by
До 31 августа ГУМ работает: 9.00--22.00, вс. 10.00--19.00
Тел. для справок: (017) 2 261 048, (029) 3 045 045
Лиц. № 5000010299987, 12.02.2009 г., Мингорисполкомом, УНП 100063737

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Шалі могуць заняцца філасофіяй, а Авены змяніць месца жыхарства



**♈ АВЕН**. Верагодны перамены, якія станоўча паўплываюць на многія галіны вашай дзейнасці. Магчымы нават пераезд на новае месца жыхарства, які будзе выкліканы новымі прафесійнымі абавязацельствамі. У пятніцу добра разабраць непатрэбныя рэчы і выкінуць хлам, які раздражняе. Вы адразу адчуеце сябе лепей. Добры дзень для ачышчэння ад усяго лішняга, таго, што аджыло.

**♉ ЦЯЛЕЦ**. Не варта выказваць свае прэтэнзіі навакольным. Ваш поспех залежыць, у першую чаргу, ад вашай дыпламатычнасці. Грандыёзныя планы на гэты тыдзень не варта будаваць — яны могуць не здзейсніцца. Аднак праяўляць актыўнасць не толькі не шкодна, але і вельмі пажадана. Блізкія людзі могуць звяртацца да вас па параду. Пастарайцеся быць больш прадбачлівымі — ёсць шанц паўтарыць памылкі, якія ўжо былі аднойчы зроблены.

**♊ БЛІЗНЯТЫ**. Літаральна з першых дзён тыдня з'явіцца шанц сацыяльнага росту. Зарука поспеху — у выкарыстанні асабістых і дзелавых сувязяў. Гэты час запомніцца мноствам сустрэч і цікавымі знаёмствамі. Не адкладвайце вырашэнне асабістых праблем у доўгую скрыню. У аўторак могуць здзейсніцца самыя смелыя мары, у гэты дзень добра складаць планы і разглядаць шляхі іх рэалізацыі.

**♋ РАК**. Цудоўны настрой, добрае самаадчуванне і ўпэўненасць у сваіх сілах могуць стаць фонам тыдня. У панядзелак можа падвесці сувязь — і сустрэча адкладзецца на няпэўны перыяд. У аўторак не хапайцеся за шмат заняткаў адначасова, а лепш выберыце галоўнае і давядзіце да канца. У сераду праявіце кемлівасць у адстойванні свайго меркавання — і тады, як па ўзмаху чароўнай палачкі, з'явіцца ўсё неабходнае для імклівага руху вашага бізнэсу.

**♌ ЛЕЎ**. У пачатку тыдня пастарайцеся не выступаць з ідэямі і прапановамі. Калі вырашыце выдзеліцца такім чынам, вас могуць няправільна зразумець. Не варта ствараць сабе лішніх праблем. Бліжэй да канца тыдня выказаць свае прэтэнзіі могуць дзеці: і чым яны старэйшыя, тым больш прэтэнзій у іх будзе. Давядзецца перагледзець некаторыя свае прынцыпы і змяніць успрыманне рэчаіснасці.

**♍ ДЗЕВА**. Давядзецца шмат увагі надаваць навакольным людзям. Калі захочацца вострых адчуванняў, давядзецца пачакаць — гэты тыдзень наўрад ці падыходзіць для такіх эксперыментаў. Цікавыя ініцыятыўныя прапановы могуць зыходзіць ад партнёраў па бізнэсе. У аўторак можна будаваць планы на самую блізкую будучыню. У суботу абавязаны парадаваць сваіх блізкіх, інакш крыўды і раздражненне могуць абрушыцца на вас у нядзелю раніцай.

**♎ ШАЛІ**. Не варта рабіць лішніх рухаў. Мітусня толькі стоміць, спакой жа дапаможа ў многім разабрацца. Паберажыце здароўе, але не расслабляйцеся зусім. У сераду не здзіўляйцеся думкам філасофскага характару — гэта дзень для роздумаў і духоўнага росту. У пятніцу магчымыя не па вашай віне невялікія праблемы ў адносінах з дзелавымі партнёрамі. Дачакайцеся, пакуль страсці ўлягуцца, і вазьміце ініцыятыву ў свае рукі.

**♏ СКАРПІЁН**. Пастарайцеся скласці план дзеянняў і арыентуйцеся па ім, інакш патонеце ў шматлікіх занятках і клопатах. У панядзелак праявіце разумную асцярожнасць, не давайце нагоды для плётак зайздросным калегам. У сярэдзіне тыдня давядзецца прысвяціць працы шмат сілаў і часу, нягледзячы на ўнутранае супраціўленне. Памятайце, што перагружаць сябе таксама не варта. У пятніцу давядзіце пачатае да канца — гэта таго варта.

**♐ СТРАЛЕЦ**. Тыдзень праляціць нібы ў калейдаскопе. У панядзелак і аўторак збярыцеся з сіламі для новай працы ў сераду. Калі штосьці не будзе атрымлівацца, пастарайцеся не ісці напралом — адкладзіце на некалькі дзён. Чым менш вы будзеце гаварыць пра свае планы і намеры, тым хутчэй яны здзейсняцца. Пастарайцеся не сварыцца з блізкімі з-за дробязяў — гэта не прынясе нічога добрага.

**♑ КАЗЯРОГ**. Каб дабіцца жаданага выніку, вам неабходна праяўляць ініцыятыву, уносіць творчыя прапановы, захоўваць узаемаразуменне з калегамі. Думкі, што вас недастаткова цэняць, лепш гнаць адразу, перш чым за іх стане сорамна. Не адмаўляйцеся ад дапамогі сяброў пры абдумванні планаў на будучыню. У выхадныя дазвольце сабе маленькія слабасці.

**♒ ВАДАЛЕЙ**. Праца ўвойдзе ў больш спакойны выток, хоць бурныя ўсплёскі мінулага могуць яшчэ напомніць пра сябе. У аўторак давядзецца актыўна адстойваць свае інтарэсы. Праяўляючы сілу волі, з дапамогай мэтанакіраванасці і ўпартасці зможаце даказаць навакольным сваё права на самастойнасць і незалежнасць. У чацвер прытрымайце свае эмоцыі і зменшыце амбіцыі, інакш можаце наламаць дроў.

**♓ РЫБЫ**. Варта больш давяраць сваім прадчуванням і інтуіцыі. Вырашальнае значэнне для руху наперад, да мэты, адыграе інфармацыя. Толькі абавязкова ўпэўніцеся ў яе праўдзівасці. У аўторак можа ўзнікнуць сітуацыя, калі давядзецца займацца некалькімі заняткамі адначасова. Вынікі гэтых намаганняў адчуеце на наступным тыдні — і яны вас парадуюць. Выкарыстоўвайце кожную магчымасць правесці больш часу дома і зрабіць неабходныя набыткі для сям'і.

## Усміхнёмся!

**Прадаецца піяніна «Элегія», б/к. На накрыўцы невялікая расколіна ад сякеры.**

☺

— Не, усё ж у наш час музыка была больш меладычная...

— Бабуля, гэта міксер!



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4307. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12